экр 3224 07/228

Библиотека АН БССР

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

# Калгасніца Капыльшчыны

№ 19 (1772)
Панядзелак 1 МАЯ 1944 г.

Орган Капыльскага РК КП(б) Беларусі.

**СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!**

**Няхай жыве 1-ае МАЯ — агляд баявых сил працоўных усяго свету, якия змагаюцца супроць нямецка-фашысцких захопникаў!**

## УСЕ НА КАНЧАТКОВЫ РАЗГРОМ ВОРАГА!

Сёння народы Савецкага Саюза сустракаюць першамайскае свята у абстаноўцы небывалых па свайму размаху гистарычных перамог над нямецка-фашысцкими захопниками.

Першамайскае свята супадае з радасными днями бліскучых перамог Чырвонай Арміи над заклятым ворагам, з днями, кали вайна уступила на шлях канчатковага разгрома гитлераўскай Германии и яе бандыцких орд. Нашы войски ужо заканчваюць вызваленне Савецкай Украины, Крыма, Малдавии, амаль поўнасцю вызвалили Гомельскую и Палескую области и рад раёнаў Беларуси, сакрушаюць ворага у Румынии, нясуць на сваих сцягах свабоду народам Еўропы, якия стогнуць пад фашысцким ботам.

Азвярэлыя людаеды-немцы перад сваим канцом учыняюць усё новыя и нечуваныя злачынствы над нашым народам, усими сродками импнуцца ажыццявиць свой людаедски план масавага знишчэння савецких людзей.

Але зверствы ап'янелага ад крыви гитлераўскага гадаўя не зламали волю беларускага народа. Ен не схиляў сваёй гордай галавы перад ворагам.

Хто не ведае пра баявыя подвиги беларуских багатыроў—партызан? Гэта яны, народныя мсциўцы, прымусили подлага ворага дрыжаць асинавым листом, хавацца у сваих гарнизонах за дротавыми загародками, у падзямеллі. Ляцяць пад адкос варожыя цягнiкi, узнимаюцца уверх аўтамашыны, гинуць ад партызанскага меча тыя, хто з мечам прыйшоў на беларускую зямлю, каб заняволиць яе.

Няма супакою гитлераўцам и ад партызан нашага раёна. Тольки партызаны Н-ских атрадаў, якими камандуе Никалай Ш., за 27 дзён красавика пусцили пад адкос 6 варожых эшалонаў, узарвали 18 аўтамашын, перэзали 11.500 метраў сувязи, забили и паранили звыш 380 агидных фрыцаў и их халуяў.

Пакуль вораг топча нашу родную зямлю—ни на мінуту супакою!

**Працоўныя Капыльшчыны!** Зрывайце крывавыя планы фашыстаў, своечасова разгадвайце их замыслы, не паддавайцеся на их правакацыи. Пры з'яўленни гитлераўцаў скрывайцеся и паведамляйце аб гэтым партызанам.

**Сяляне и сялянки!** Засявайце хутчэй и больш яравых. Помнице, што ураджай гэтага года вы будзеце збираць для сябе, для нашай краины и Чырвонай Армии.

**Партызаны и партызанки!** Узмацняйце удары па нямецка-фашысцких захопниках. Грамице варожыя штабы и гарнизоны. Перарэзайце шляхи, па яких адступаюць акупанты. Не давайце им магчымасци падвозиць к фронту тэхнику и жывую силу. Ни аднаго эшалона, аўтамашыны к линии фронта. Абараняйце нашых людзей ад знишчэння их гитлераўцами и угона у нямецкае рабства. Дзейничайце смела и рашуча, дапамагайце Чырвонай Армии наблизиць дзень нашага вызвалення.

Няхай жыве 1-ае Мая—агляд баявых сил працоўных усяго свету, якия змагаюцца супроць нямецка-фашысцких захопникаў!

## 1-ое МАЯ 1944 ГОДА

Зимних туч рассеялась завеса,
Озарен весной советский край.
Симферополь, Киев и Одесса
Вместе с нами встретят Первомай.

Обменяются приветом братским
Николаев, Ялта, Ленинград;
В этот день по зданьям ленинградским
Не ударит пушечный снаряд.

Поглядим мы зорко, по-хозяйски:
То, что уходя разрушил враг,
Все вернем!—гремит нам первомайский
На ветру колеблющийся флаг.

Верим мы, что будет триумфален
Этот праздник в будущем году.
Свой родной народ товарищ Сталин
Призовет к счастливому труду.

А сегодня на переднем крае
Встретим утро яростным огнём.
Чтобы стал наш праздник Первомая
Тысячам врагов последним днем!

С. Маршак.

## НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

На працягу з 25 па 29 красавика на франтах истотных змен не адбылося.

За гэты час нашы войски на усих франтах падбили и знишчыли 181 нямецки танк. У паветраных баях и агнем зенитнай артылерии збит 251 самалёт. Акрамя гэтага на аэрадромах працiўника знишчаны 33 самалёты.

### Налёты нашай авияцыи на Львоў и Оршу

У ноч на 28 красавика наша авияцыя зрабила налёт на чыгуначны вузел Львоў и бамбардзiравала скапленне воинских эшалонаў, а таксама зрабила налёт на аэрадром працiўника у раёне Оршы и падвергла бамбардзiроўцы самалёты, склады гаручага и боепрыпасаў, якия знаходзилися на аэрадроме. У вынику бамбардзiроўкя узникли шматликия пажары, якия суправаждалися моцными узрывами.

## Выники спаборництва

Па инициятыве комсамольскай арганизацыи у нашым атрадзе з пачатку красавика разгарнулася социялистычнае спаборництва за дастойную сустрэчу 1-га Мая. У спаборництве з атрадам имени Чапаева мы занялі першае месца и дабилися нядрэнных рэзультатау. За 27 дзён красавика месяца партызанами нашага атрада узарвана на минах 8 аутамашын и адна павозка працивника, дзе было забита и ранена 53 гитлерауцау. Таксама спушчаны пад адкос нямецки эшалон. У выніку крушэння разбит паравоз, 3 цыстэрны з гаручым, 1 платформа и 2 пасажырския вагоны.

Социялистычнае спаборництва было разгорнута и унутры атрада памиж асобными падраздзяленнями. На першае месца вышла падраздзяленне, дзе камандзирам Иван Д. На баявым рахунку гэтага падраздзялення за красавик месяц знаходзицца спушчаны пад адкос нямецки эшалон, 3 узарваныя аутамашыны и 35 забитых и раненых гитлерауцау.

Пры выкананни баявых заданняу асаблива адзначылися партызаны Давидзенка, Зубрыцки, Михаил П., Никалай К., Грыгорый К., Антон Д. и многа других.

**Никалай Ч.,**
**Камисар Н-скага атрада.**

## Комсамольцы ў авангардзе

У прадмайскім социялистычным спаборництве у нашым атрадзе авангардная роль належыць комсамольцам.

Група комсамольцау на чале з таварышам Науменка на мине узарвала нямецкую аутамашыну з харчаваннем. Ад узрыву забиты 3 фрыцы, з яких адзин афицэр.

Другая комсамольская група (старшы тав. Сланимски) на дарозе Несвиж — Клецк узарвала 3-х тонную нямецкую аутамашыну.

Група комсамольцау (старшы Михаил Д.) у ноч на 21-ае красавика на чыгунцы Минск—Баранавичы пусцила пад адкос ишоуша на фронт эшалон працивника з танками и аутамашынами. Разбит паравоз и 5 вагонау.

Комсамольска - маладзёжная група на чале з тав. Казимирам Г. у ноч на 23 красавика таксама пусцила пад адкос нямецки эшалон. Разбит паравоз и 4 вагоны з боепрыпасами.

Група партызан, дзе старшым тав. Осмолич, выразала тэлефонна-тэлеграфную линию сувязи на 1,9 клм.

Так выконвали свае прадмайския абавязацельствы партызаны-комсамольцы атрада имени Шчорса.

**Аркадзий Б.,**
**пом. камисара па комсамолу.**

## Бязлитасна помшчу праклятай немчуры

**Письмо партызана чэха Яна Ганулиака, бышага капрала чэшскай армии.**

Як и многия тысячы чэхау, я таксама зразумеу, што адзиным и злейшым ворагам Чэхаславакии з'яуляецца гитлерауская Германия. Я зразумеу, што чэшски народ зможа заваявиць сабе свабоду и незалежнасць тольки у саюзе з героичным советским народам, пагэтаму и перайшоу у рады советских партызан.

Будучы у партызанским атрадзе им. Шчорса, бязлитасна помшчу праклятай немчуры за кроу и слезы свайго народа. На сваим баявым рахунку маю нимала забитых гитлерауцау. У баю на дарозе Слуцк-Минск я забиу двух фрыцау и падабрау трафеи—2 винтоуки, у селавицким баю забиу аднаго афицэра и двух палицаяу. 14 красавика прабрауся у Копыль, забиу палицэйскага и падабрау трафеи.

З вялікай радасцю я даведауся аб выхадзе Чырвонай Армии к границам Чэхаславацкай республики. Ужо близка час, кали и мая радзима будзе свабоднай. Сазнание гэтага прыдае мне новыя силы у барацьбе з ворагам.

**Ян Ганулиак**

## Атрыманыя поспехи натхняюць на новыя подвиги

Партызаны падраздзялення, дзе камандзирам таварыш Л. (атрад П.), к дню 1-га Мая прышли з выдатнымі баявымі поспехами, яких дабилися у ходзе прадмайскага социялистычнага спаборництва.

За 27 дзён красавика партызаны падраздзялення узарвали 3 грузавыя аутамашыны працивника, адна з яких была з жывой силай. Ад узрыву забита 11 и ранена 10 гитлерауцау.

З засады партызанами забита 4 и ранена 6 фрыцау.

Народныя мсциуцы выразали 10 километрау тэлефонна-тэлеграфнай линии сувязи.

Акрамя гэтага партызаны пусцили пад адкос эшалон працивника з жывой силай. У рэзультаце крушэння пад абломками вагонау было налічана 70 забитых и 45 раненых гитлерауцау.

Такі прадмайски баявы рахунак аднаго з перадавых партызанских падраздзяленняу атрада имени П. Атрыманыя поспехи не заспакайваюць народных мсциуцау а, наадварот, натхняюць их на новыя баявыя подвиги. **И.**

## Прадмайски баявы рахунак

Уключыушыся у прадмайскае социялистычнае спаборництва, нашы партызанския атрады значна узмацнили свае удары па ворагу. Тольки за 27 дзён красавика месяца партызанами спушчана пад адкос 6 вайсковых эшалонау працивника з жывой силай и тэхникай. Згодна папярэдним данным, у выніку крушэнняу тольки пяци эшалонау забита 149 и ранена 85 гитлерауцау.

Партызаны на минах узарвали 18 нямецких аутамашын. Згодна папярэдним данным ад узрывау забита 77 и ранена 59 нямецких салдат и афицэрау. Разбиты 3 павозки немцау, дзе было знишчана 8 и ранена 5 немцау. Акрамя таго, партызаны выразали 11,5 километрау тэлефонна-тэлеграфнай линии сувязи.

**И. Падгорны.**

**РЭДКАЛЕГИЯ**